# ГІСТОРЫЯ

Весці БДПУ. Серыя 2. 2019. № 4. С. 6–12

УДК 94(476):[352:63] “863/1897”

## ДЗЕЙНАСЦЬ ГУБЕРНСКІХ ПА СЯЛЯНСКІХ СПРАВАХ ПРЫСУТНАСЦЕЙ ПА СПАГНАННІ КАНТРЫБУЦЫЙНАГА ЗБОРУ З ПАМЕШЧЫЦКІХ МАЁНТКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1863–1897 гг.)[1]

**С. А. Талмачова,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 22.11.19

UDC 94(476):[352:63] “1863/1897”

## ACTIVITY OF PROVINCIAL OFFICES ON PEASANT AFFAIRS ON EXACTION OF CONTRIBUTION CHARGE FROM LANDLORDS’ ESTATES IN THE TERRITORY OF BELARUS (1863–1897)

**S. Talmachova,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 22.11.19.

У артыкуле ўпершыню ў айчынннай гістарыяграфіі разглядаецца дзейнасць губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей па раскладцы і спагнанні кантрыбуцыйнага збору з дваранства беларускіх губерняў. Гэты надзвычайны збор быў уведзены Віленскім генерал-губернатарам М. М. Мураўёвым у 1863 г. як мера эканамічнай барацьбы з мясцовым дваранствам за ўдзел у паўстанні 1863–1864 гг. і праіснаваў да 1897 г. Раскрыты механізм размеркавання агульнай сумы на ўзроўні губерні і павета і вылічэння памеру кантрыбуцыі з кожнага маёнтка. Даказваецца, што кантрыбуцыйны збор адмоўна адбіўся на стане гаспадаркі Беларусі.

*Ключавыя словы:* Беларусь, губернская па сялянскіх справах прысутнасць, паўстанне 1863–1864 гг., кантрыбуцыйны збор, падаткі, дваранства, землеўладальнікі-каталікі.

For the first time in domestic historiography the article deals with the activities of provincial offices for peasant affairs on setting and exacting a contributory charge from the nobility of the Belarusian provinces. That extraordinary tax was introduced by Vilnius Governor-General M. Muravyov in 1863 as a measure of the economic struggle against the local nobility for their participation in the uprising of 1863–1864. It existed till 1897. The mechanism of distributing the total amount at province and district levels and calculating the size of contributory from each estate was discovered. It is proved that exacting of the contributory charge negatively affected the Belarusian economy.

*Keywords:* Belarus, provincial office for peasant affairs, uprising of 1863–1864, contributory charge, taxes, nobility, Catholic landowners.

*Уводзіны.* Дзейнасць органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання, функцыянальныя абавязкі і механізм іх рэалізацыі ў рэчышчы мадэрнізацыйных працэсаў, якія адбываліся ў беларускай вёсцы ў другой палове XIX ст., сталі актыўна вывучацца сучаснымі гісторыкамі. Не змяншаецца і ўвага да перадумоў, ходу і наступстваў паўстання 1863–1864 гг., яго ўплыву на далейшае развіццё грамадска-палітычнага, сацыяльнага і эканамічнага развіцця краю. Асобныя сюжэты, звязаныя з дзейнасцю органаў мясцовага кіравання, чыноўніцтва, развіццём гаспадаркі дваранства і сялянства ў парэформенную эпоху, знайшлі адлюстраванне ў гістарыяграфіі [1–5]. Пры гэтым дзейнасць губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей па спагнанні кантрыбуцыйнага збору з памешчыцкіх маёнткаў на тэрыторыі Беларусі айчыннымі даследчыкамі не вывучалася.

Губернскія па сялянскіх справах прысутнасці – органы мясцовага дзяржаўнага кіра-

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

вання, заснаваныя для рэалізацыі аграрнай рэформы 19 лютага 1861 г. Яны сталі ствараць ца ў сакавіку 1861 г. на падставе «Положения о губернских и уездных по крестьянским делам учреждениях» (далей – «Палажэнне») [6]. У іх склад увайшлі мясцовыя землеўладальнікі, абраныя на сходах прадвадзіцелей дваранства, а таксама прадстаўнікі дваранства «по приглашению от правительства», зацвярджэнне якіх адбылося адначасова з выданнем Палажэнняў 19 лютага 1861 г.

Да функцыянальных абавязкаў губернскай па сялянскіх справах прысутнасці, у адпаведнасці з “Палажэннем”, адносіўся разгляд скаргаў на дзеянні міравых пасрэднікаў і іх павятовых з’ездаў па ўсіх родах спраў у выпадку перавышэння імі ўлады ці невыканання ўсталяваных законам правілаў і парадку (арт. 126, 127). Прысутнасць разглядала і зацвярджала прадстаўленыя міравымі пасрэднікамі дабрачынныя пагадненні паміж памешчыкамі і сялянамі аб памяншэнні сялянскага надзелу (арт. 128). Да распарадчых паўнамоцтваў адносілася вырашэнне «всех подробностей» па рэалізацыі «Палажэння»: складанне каштарысаў выдаткаў, неабходных для ўтрымання прысутнасці, найму патрэбнай колькасці каморнікаў; зацвярджэнне складзеных па паветах праектаў размеркавання паселішчаў на воласці; вырашэнне спраў па павышэнні ці паніжэнні павіннасцей адносна ўсталяваных памераў; разгляд і зацвярджэнне ўстаўных грамат, якія перадаваліся на канчатковае зацвярджэнне губернскай па сялянскіх справах прысутнасці; складанне ўрочнага палажэння і ўсталяванне тэрмінаў, з якіх пачынаўся летні і зімовы час працы і інш. (арт. 129) [6].

У сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. на губернскія па сялянскіх справах прысутнасці былі ўскладзены многія абавязкі, не прадугледжаныя «Палажэннем» 1861 г. Іх выкананне з’яўляецца асаблівасцю дзейнасці мясцовых установаў па сялянскіх справах на тэрыторыі Беларусі. Адным з такіх абавязкаў стала раскладка працэнтнага збору з памеснага дваранства. Гэты кантрыбуцыйны збор у памеры 10 % даходу з маёнткаў быў уведзены ў 1863 г. Віленскім генерал-губернатарам М. М. Мураўёвым. Дваране, якія валодалі дамамі ў гарадах, плацілі збор у 1 % ад іх вартасці [7, с. 296, 297].

Як надзвычайная мера кантрыбуцыя першапачаткова ўводзілася для ўсіх мясцовых памешчыкаў, незалежна ад іх веравызнання, але ў розных памерах. Генерал-губернатар сцвярджаў, што для «рускіх» памешчыкаў спагнанне ад 1,5–2,5 да 3 % ад гадавога прыбытку было зроблена «в виде приглашения содействовать правительству, которое было вправе надеяться, что русские патриотические чувства не дозволят ни одному из них роптать на это или жаловаться» [8, л. 15]. Аднак праваслаўныя землеўладальнікі выказалі незадавальненне такой палітыкай, на што М. М. Мураўёў заўважыў, што гэта мера – не пакаранне, а адна з форм садзейнічання ўраду, які вымушаны марнаваць велізарныя сродкі на абарону прыхільнікаў Расіі ад мяцежнікаў [7, с. 299, 300]. Землеўладальнікі рымска-каталіцкага веравызнання, якіх урад лічыў прыхільнікамі паўстання, павінны былі плаціць кантрыбуцыйны збор у поўным памеры. М. М. Мураўёў адзначыў у справаздачы аб кіраванні краем Аляксандру II, што галоўнай мэтай такой меры было «при самом разгаре мятежа… отнятие у них (памешчыкаў-католікаў. – *С. Т.*) средств поддержания вооруженного восстания [9, л. 4 адв.]. Аднак ужо праз некалькі месяцаў царскія ўлады адзначылі варожыя адносіны рускіх памешчыкаў да нацыянальнавызваленчага руху ў краі. Таму Заходні камітэт у ліпені 1863 г. знізіў кантрыбуцыйны збор з рускіх памешчыкаў да 2,5 %, а вясной 1864 г. поўнасцю вызваліў іх ад гэтай павіннасці. У пачатку 1865 г. такога ж гонару былі ўдастоены і остзейскія землеўласнікі [10, л. 217–221; 11, л. 276–278]. Па падліках А. П. Жытко, толькі ў 1869 г. 10-працэнтны збор з маёнткаў памешчыкаў у Віленскай губ. склаў 255 430 руб., Віцебскай – 143 600, Гродзенскай – 307 460, Мінскай – 281 380 і Магілёўскай – 129 800, усяго ж у гэтым годзе памешчыкі-католікі беларускіх губерняў заплацілі 1 118 тыс. руб. [2, с. 111, 112].

Прызначаная на губерню сума размяркоўвалася на кожныя тры гады на аб’яднаных пасяджэннях губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей і асобых аб земскіх павіннасцях прысутнасцей. На пасяджэнні маглі запрашацца эксперты (памешчыкі, заводчыкі і інш.). Размеркаванне адбывалася па паветах. Улічвалася плошча зручнай зямлі (акрамя лесу), яе адносная каштоўнасць, плошча пад лесам, ступень развіцця прамысловасці і ўвогуле прыбытковасць маёнтка. Сума працэнтнага збору, вызначаная для кожнага павета, у сваю чаргу, размяркоўвалася спецыяльнай камісіяй. У яе склад уваходзілі павятовы прадвадзіцель дваранства (старшыня), спраўнік, два міравыя пасрэднікі павета па прызначэнні павятовага з’езда і 4 памешчыкі, маёнткі якіх падлягалі збору. Члены-памешчыкі прызначаліся камі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сіяй з мясцовых землеўладальнікаў па выбранні губернскага прадвадзіцеля дваранства і зацвярджаліся губернатарам. Камісія па пэўных крытэрыях вызначала прыбытковасць кожнага маёнтка. Затым сума збору, прызначаная з павета, размяркоўвалася паміж землеўладальнікамі раўнамерна па прыбытках. Вызначаная камісіяй раскладка з падрабязнымі тлумачэннямі перадавалася на зацвярджэнне губернатара, а той перадаваў дакументы аб'яднанаму сходу губернскай па сялянскіх справах і асобай па земскіх павіннасцях прысутнасцей. На пасяджэнні апошняга прымалася канчатковае рашэнне. Пры памяншэнні аклада з пэўнага маёнтка адпаведная сума раўнамерна размяркоўвалася паміж астатнімі таго ж павета. У выпадку пераходу зямлі ва ўласнасць рускім памешчыкам збор з іх выключаўся з сумы, прызначанай на павет, з наступнага пасля такога пераходу года. Падобныя выпадкі кожны раз абмяркоўваліся на пасяджэннях названых аб'яднаных інстытуцый [12, л. 1-1 адв.].

Працэс звычайна праходзіў наступным чынам. Так, 13 верасня 1869 г. адбылося пасяджэнне аб'яднаных прысутнасцей Віленскай губ. для зацвярджэння размеркавання працэнтнага збору з маёнткаў памешчыкаў каталіцкага веравызнання. Кожная павятовая камісія прадставіла свае прапановы ў адпаведнасці з папярэдняй раскладкай. На аб'яднаным пасяджэнні разглядаліся і абмяркоўваліся скаргі ад мясцовых землеўладальнікаў на размеркаванне збору. Частка з іх была «принята в уважение». Так, у камісію Ашмянскага павета паступіла 109 скаргаў (з іх 78 прызнаны слушнымі), Віленскага – 47 (39 прызнаны), Троцкага – 35 (29 прызнаны), Дзісненскага – 22 (15 прызнаны), Свянцянскага – 156 (56 прызнаны), ад Лідскага і Вілейскага паветаў скаргаў не было, але з апошняга паступілі хадайніцтвы на імя губернатара ад памешчыкаў Заблоцкай і Хрысцініча. Дарэчы, апошнія скаргі нават не разглядаліся, таму што былі пададзены не ў належным парадку [12, л. 13-18 адв.]. У выніку ў губерні патрабавалася нанава размеркаваць па паветах адпаведны кантрыбуцыйны збор. Пры гэтым аб'яднаная прысутнасць адзначыла неабходным прасіць генерал-губернатара выдаткаваць з працэнтнага збору не менш як 200 руб. на наём чыноўнікаў для «пересоставления раскладки» на 1869 г., таму што канцэлярыі губернскіх па сялянскіх справах і асобай па земскіх павіннасцях прысутнасцей былі вельмі загружаны бягучымі справамі [12, л. 18].

Адзначым, што падобная работа паўтаралася штогод. 10 снежня 1874 г. асобыя аб земскіх павіннасцях прысутнасці былі ліквідаваны. Таму на падставе цыркуляра міністра ўнутраных спраў ад 31 жніўня 1875 г. на месцах кантрыбуцыйны збор размяркоўвалі толькі губернскія па сялянскіх справах прысутнасці [12, л. 46, 67, 75]. Дзяржаўнае казначэйства вылічала памер працэнтнага збору з заходніх губерняў на трохгоддзе, але ў губернях і паветах неабходна было пераглядаць каштарысы штогод з-за змяненняў у землеўладанні (продаж маёнткаў рускім памешчыкам, прылічэнне часткі дваран да благанадзейных, перадача ўласнасці непаўналетніх пад апеку і вызваленне ад яе і інш.). Напрыклад, на падставе Правілаў ад 3 сакавіка 1869 г., на 1870 і 1871 гг. былі вызначаны новыя памеры збору з губерняў: з Віленскай – 204 700 руб., Віцебскай – 115 100 руб., Гродзенскай – 246 400 руб., Мінскай – 225 500 руб., Магілёўскай – 104 000 руб., а ўсяго – 895 700 руб., што на 19,9 % менш, чым па папярэдняй раскладцы [16, с. 65].

На падставе ўказа Аляксандра II ад 31 снежня 1870 г. працэнтны збор з маёнткаў дваран польскага паходжання ў 9 заходніх губернях «постановлено прекращать постепенно». Меркавалася, што гэта адбудзецца, калі 2/3 памешчыцкай маёмасці пяройдзе да ўладальнікаў не польскага паходжання, а колькасць апошніх будзе не менш паловы ўсіх уладальнікаў маёнткаў. Урад адзначаў «обременительность» збору для фінансавага стану памешчыкаў, таму ў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях з 1871 г. ён быў зніжаны напалову [12, л. 28; 17, с. 631, 632]. Так, у 1890 г. памешчыкі-каталікі Віленскай губ. павінны былі заплаціць 88,8 тыс. руб. кантрыбуцыйнага збору, што было на 56,6 % менш, чым у 1871 г. [18, л. 39].

Пры вызначэнні прыбытковасці маёнткаў губернскія па сялянскіх справах прысутнасці карысталіся рознымі методыкамі падліку. Так, адны размяркоўвалі ўсе маёнткі на разрады (іх было да шасці) у адпаведнасці з вызначэннем павіннасцей сялян на карысць памешчыкаў па арт. 150 «Мясцовага палажэння» ад 19 лютага 1861 г. Яны вызначалі для кожнага сярэднюю норму прыбытку з дзесяціны, кіруючыся прыбытковасцю маёнткаў, вылічанай па звестках папярэдніх раскладак (за 1864–1867 гг.), ці па планах, інвентарах і кантрактах (у арэндных маёнтках), альбо па звестках ад саміх уладальнікаў. Іншыя прысутнасці пры вылічэнні прыбытковасці маёнткаў кіраваліся колькас-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

цю прыбытку з дзесяціны зямлі і лесу, вылічаных асобна для кожнага маёнтка запрошанымі на пасяджэнне прысутнасці экспертамі з памешчыкаў. Апошнія прымалі за адзінку вымярэння прыбытак з дзесяціны зямлі і лесу лепшага па эканамічных умовах павета, вылічвалі адносную прыбытковасць дзесяціны іншых паветаў. Нарэшце, некаторыя губернскія прысутнасці вызначалі прыбытак з памешчыцкай дзесяціны, кіруючыся колькасцю выкупных плацяжоў з сялянскай дзесяціны, а таксама павіннасцей, якія адбываліся сялянамі [12, л. 50, 51].

Раскладкі на трохгоддзе 1872, 1875 і 1878 гг. былі зроблены губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі на падставе папярэдніх раскладак і па звестках павятовых раскладачных камісій. У сваю чаргу, павятовыя камісіі пры размеркаванні працэнтнага збору паміж маёнткамі кіраваліся данымі аб колькасці зямлі, лесу і прыбытку з аброчных плацяжоў, сабраных павятовымі прадвадзіцелямі дваранства, спраўнікамі і міравымі пасрэднікамі. Некаторыя камісіі карысталіся таксама і звесткамі, сабранымі для абкладання дзяржаўнымі земскімі павіннасцямі на падставе ўказа ад 6 красавіка 1870 г. Парадак вызначэння прыбытковасці маёнткаў павятовымі камісіямі нават у адной губерні вызначаўся часам большай разнастайнасцю, чым губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі. Напрыклад, адны павятовыя камісіі адносілі да першага разраду сядзібную і ворыўную зямлю, да другога і трэцяга – пашы і землі «под срубом». Іншыя ж камісіі прылічалі да першага разраду ворыва, сенажаці і сядзібную зямлю, а да другога – пашы і хмызнякі [12, л. 51–51 адв.]. Пры вызначэнні прыбытку ад лесу ў адным павеце камісія меркавала да вырубкі 1/40, у другім – 1/50, у трэцім – 1/60 частку леса, ацэньваючы дзесяціну спелага лесу ў 40, 50, 60 і 80 руб. Іншыя ж камісіі падзялялі лес на разрады і вызначалі прыбытак кожнай дзесяціны наяўнага лесу [12, л. 51–51 адв.].

Прыбытак з фабрык, заводаў, млыноў і інш. таксама вызначаўся ў межах адной і той жа губерні па-рознаму. Так, у адным павеце даход з вінакурні вызначаўся ў 10 руб. з пуда «припасов, употребленных в затор», а ў другім павеце той жа губерні – прыбытак і з дзеючых, і не дзеючых вінакурань вызначаўся «огулом» у 200 руб. Аналагічна прыбытак ад млыноў вылічваўся ў адных паветах па арэнднай плаце, у другіх лічылася, што просты млын даваў 30 руб. чыстага прыбытку, а крупчатка – 100 руб. [12, л. 51 адв. – 53]. Вынікам такой разнастайнасці ў сродках вызначэння павятовымі камісіямі даходнасці маёнткаў стала тое, што ў кожным павеце кантрыбуцыйны збор нераўнамерна суадносіўся з прыбытковасцю маёнткаў. У іншых выпадках павятовыя камісіі зусім не вылічвалі прыбытковасці, а проста размяркоўвалі працэнтны збор па колькасці дзесяцін у маёнтках [12, л. 51 адв. – 53]. Такім чынам, нават у межах адной губерні не было адзінства ў спосабе вызначэння павятовымі камісіямі прыбытковасці маёмасці памешчыкаў-католікаў. Гэта непазбежна прыводзіла да нераўнамернасці абкладання плацельшчыкаў кантрыбуцыйным зборам. У студзені 1880 г. Віленскі генерал-губернатар П. П. Альбедзінскі адзначаў, што такі парадак не адпавядаў мэце ўрада, выкладзенай у правілах спагнання працэнтнага збору ў заходніх губернях ад 3 сакавіка 1869 г. [12, л. 53 адв.; 13, с. 186–188].

Акрамя кантрыбуцыйнага збору, памешчыкі-католікі сплочвалі і звычайныя падаткі, як і рускія дваране: губернскі земскі, дзяржаўны пазямельны, прыватны дваранскі [8, л. 15]. Сума іх налічвалася з плошчы прыдатнай зямлі і лесу. Памеры гэтых падаткаў увесь час павялічваліся. Калі ў 1866–1869 гг. землеўласнікі Чавускага і Горыцкага паветаў плацілі да 41/8 кап. з дзесяціны зямлі, то ў 1869 г. – 7 кап., а ў 1871 г. – 91/24 кап. У 1872 г. усе прыватныя землеўласнікі Віцебскай губ. плацілі падаткі па 16 кап. з дзесяціны, а для дваран губерні сярэдні памер падаткаў за 1872–1883 гг. склаў з дзесяціны прыдатнай зямлі 21,3 кап. і лесу – 6,5 кап. За гэты ж час дваране-католікі з улікам 10 % збору плацілі адпаведна 35,7 кап. і 9,0 кап. [2, с. 112].

Да таго ж, дваране рымска-каталіцкага веравызнання з 1866 г. па распараджэнні Віленскага генерал-губернатара А. Л. Патапава павінны былі адбываць і натуральныя павіннасці, аднолькава як і сяляне. З 1842 г. на іх быў ускладзены і абавязак рамантаваць і будаваць праваслаўныя храмы. Цяпер жа дваране-католікі павінны былі выплачваць падатак на ўтрыманне праваслаўнага святарства. Гэтыя грошы ішлі на будаўніцтва ці рамонт дамоў папоў і дыяканаў, іх гаспадарчых памяшканняў. Так, памешчыкі Мінскай губ. у 1869 г. на гэтыя мэты заплацілі падатак у памеры 1,25 кап. з дзесяціны зямлі. У 1872–1883 гг. дваране Віцебскай губ. выплачвалі на гэтыя мэты ўжо па 2,3 кап. з дзесяціны прыдатнай зямлі і 0,6 кап. з дзесяціны лесу [2, с. 112].

Кантрыбуцыйныя зборы і іншыя спагнанні цяжка адбіваліся на матэрыяльным стане

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

маёнткаў. Так, спецыяльная камісія па даследаванні сельскай гаспадаркі ў Расіі (Валуеўская) у пачатку 70-х гг. XIX ст. адзначыла, што ў Рэчыцкім павеце Мінскай губ. у аднаго буйнога землеўласніка раней утрымлівалася 20 тыс. авечак. Да 1869 г. усе яны былі вельмі танна прададзены на мяса, каб выплаціць памер першай кантрыбуцыі [2, с. 111, 112]. Камісія сцвярджала, што «авечкагадоўля... пасля 1863 г. стала мізэрнай. Авечкі, як і іншая жывёла, пайшлі пад нож для выплаты першага кантрыбуцыйнага збору з памешчыцкіх маёнткаў». За гэтыя гады статак танкарунных авечак зменшыўся амаль у два разы [2, с. 168]. Па меркаванні камісіі, з-за неабходнасці сплочваць 10-працэнтны збор у першае парэформеннае дзесяцігоддзе былі ліквідаваны ўсе прыватніцкія конезаводы ў Мінскай губ. Аналагічныя працэсы адбываліся і ў іншых губернях краю [2, с. 142].

У цэлым, па падліках А. П. Жытко, з 1864 да 1870 г. на тэрыторыі Беларусі, за выключэннем Гродзенскай губ., наглядалася абсалютнае і адноснае падзенне колькасці і буйной рагатай жывёлы. Узгаданая ўрадавая камісія канстатавала, што пасля рэформы 1861 г., асабліва пасля паўстання 1863 г., дваранска-памешчыцкая жывёлагадоўля ў Заходнім краі прыйшла ў заняпад. Надзвычайнае палажэнне, 10 % кантрыбуцыйны збор, іншыя дадатковыя павіннасці прывялі да таго, што частка жывёлы пайшла на ўбой для выплаты кантрыбуцый. Памяншэнне статка было звязана і са скарачэннем пасеваў, асабліва кармавых траў. Так, у Віцебскай губ. да 1861 г. уладальнікі маёнткаў мелі ў сярэднім па 3 штукі рагатай жывёлы на 1 дзес. азімага пасеву, а да канца 60-х гг. колькасць буйной рагатай жывёлы і коней паменшылася больш чым на палову. Тое ж самае адбывалася і ў іншых беларускіх губернях. Пры гэтым колькасць жывёлы ў сялян значна павялічылася. У Віленскай губ. статак сялянскай жывёлы вырас на 20 %, у Віцебскай – у 2 разы і г. д. Рост колькасці буйной рагатай жывёлы ў Гродзенскай губ. таксама адбыўся за кошт сялянскіх гаспадарак, асабліва калі мець на ўвазе, што ў гэтай губерні быў і самы нізкі працэнт дваранскага землеўладання [2, с. 148, 149].

Выплата кантрыбуцыйнага збору нанесла значны ўрон і лясной гаспадарцы краю. Многія памешчыкі былі вымушаны ў вялікіх памерах прадаваць лес. Так, калі ў 1872 г. у Віцебскай губ. на долю памесных дваран прыпадала 87,0 % усяголяснога масіву губерні, то ў 1892 г. – 67,4 % [20, ч. 2, с. 289]. У 1887 г. у Мінскай губ. на долю прыватнікаў прыходзілася 72,6 % лясных зямель, а ў 1892 г. – 53,5 % [21, с. 19]. Такім чынам, адбывалася хуткае скарачэнне лесу. Гэтаму садзейнічаў і пастаянны рост цаны на яго. Так, калі ў 1882 г. у Магілёўскай губ. кошт адной дзесяціны будаўнічага лесу вагаўся ад 22 да 220 руб., то ў 1913 г. кошт хвойнага лесу ў сярэднім складаў 893 руб., а ліставога – 609 руб. за дзесяціну. Высокімі былі і цэны на дровы. Адзін кубічны сажань хвойнага дрэва складаў 17,9 руб., а ліставога – 12,1 руб. [2, с. 188, 189].

Такім чынам, абязлесенне тэрыторыі Беларусі адбывалася пераважна за кошт скарачэння памешчыцкіх лясных масіваў. Нястрымнае знішчэнне лясоў выклікала трывогу царскага ўрада. 4 лютага 1888 г. быў выдадзены лесаахоўны закон, які на некаторы час упарадкоўваў лесаводства. Ён прадугледжваў абмежаваную высечку лесу і арганізацыю навуковай лесагаспадаркі. Аднак павелічэнне крэдытнай заказычанасці памешчыцкіх маёнткаў, з аднаго боку, і кошту лесу – з другога, прыводзілі да росту высечкі прыватнаўласніцкага лесу [2, с. 189, 190].

Роля губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей у размеркаванні кантрыбуцыйнага збору мела важнае значэнне, таму што з сумы, атрыманай у выглядзе кантрыбуцый, выдаваліся ў краі 50 %-ная надбаўка да жалавання чыноўнікам, утрымліваліся жандарскія каманды і г. д. Адмова ад працэнтных збораў азначала ўскладанне гэтых мільённых выдаткаў на казну. Адначасова ўрад усведамляў, што падобныя меры прыводзяць да заняпаду гаспадаркі. Таму зборы паступова скарачаліся за кошт памяншэння колькасці тых памешчыкаў, якія даказалі сваю палітычную добранадзейнасць [13; 14, л. 93; 15, л. 13]. Так, мінскі губернатар хадайнічаў аб вызваленні ад выплаты кантрыбуцый 131 памешчыка губерні пад маркай іх поўнай палітычнай надзейнасці [1, с. 70; 2, с. 113]. У некаторых выпадках кантрыбуцыйны збор спаганяўся ў паменшаным памеры – на 25 %, 50 %, часам ад выплаты вызвалялася частка маёнтка памешчыка, прызнанага благанадзейным. Некаторыя землеўладальнікі, якія даказалі сваю лаяльнасць ураду, увогуле вызваляліся ад выплаты працэнтных збораў [12, л. 12].

Пазнейшымі ўрадавымі пастановамі ад збору вызваляліся афіцэры-пенсіянеры і ваенныя ўрачы, а таксама параненыя пад час руска-турэцкай вайны [12, л. 39-40 адв.]. Напрыклад, у Сенненскім павеце Магілёўскай губ. па гэтай прычыне ад збору былі вызвалены

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

14 маёнткаў з 165 [19, л. 8; 1, с. 70; 2, с. 113]. Пры гэтым калі павятовыя камісіі своечасова не выключалі пазбаўленыя ад збору маёнткі са спісаў і не памяншалі адпаведна суму збору з каштарысаў, то гэтая сума пераносілася на наступнае трохгоддзе і спаганялася з іншых памешчыкаў польскага паходжання, што прыводзіла «к несправедливому обременению плательщиков» і станавілася для іх, па словах міністра фінансаў А. М. Княжэвіча, “произвольной административной карательной мерой” [12, л. 36].

Кантрыбуцыйны збор з памешчыкаў-католікаў заходніх губерняў канчаткова быў скасаваны толькі ў 1897 г. [22].

Такім чынам, кантрыбуцыйны збор, уведзены у 1863 г. Віленскім генерал-губернатарам М. М. Мураўёвым як надзвычайная мера, праіснаваў больш трох дзясяткаў гадоў. Ён спаганяўся з дваран-католікаў краю з мэтай эканамічнай барацьбы з мясцовым дваранствам за ўдзел у паўстанні 1863–1864 гг. Пасля падаўлення паўстання гэтыя грошы ішлі на забеспячэнне дадатковага жалавання чыноўнікам, якія прыехалі на службу на тэрыторыю Беларусі з унутраных губерняў Расійскай імперыі, на будаўніцтва і ўтрыманне праваслаўных цэркваў і інш. Улады не спяшаліся поўнасцю адмаўляцца ад такога шматмільённага прыбытку, бо інакш выдаткі, выкліканыя палітычнымі меркаваннямі, ускладаліся б на дзяржаўны бюджэт. Пры гэтым урад усведамляў, што кантрыбуцыйны збор адмоўна адбіваўся на стане гаспадаркі рэгіёну.


*Літаратура і крыніцы*

1. *Самбук, С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / ред. В. П. Панютич. – Минск : Наука и техника, 1980. – 223 с.
2. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. : манаграфія / А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.
3. *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2013. – 335 с.
4. *Токць, С. М.* Сацыяльныя і культурныя працэсы ў беларускай вёсцы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / С. М. Токць. – Мінск : ДІКСТ БДУ, 2016. – 327 с.
5. *Долгач, Т. В.* Губернские по крестьянским делам присутствия на территории Беларуси: формирование, структура, деятельность (1861–1903 гг.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Т. В. Долгач. – Минск, 2019. – 200 с.
6. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). Собр. 2-е. – Т. 36 (1861). – Отд. 1. – № 36660.
7. Музей графа М. Н. Муравьева. Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края : в 2 ч. – Вильна : Губернская типография, 1913–1915. – Ч. 1 : Переписка по политическим делам гражданского управления с 1 января 1862 по май 1863 г. / сост. А. И. Миловидов. – 1913. – 441 с.
8. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). – Ф. 908. Воп. 1. Спр. 171.
9. РДГА. – Ф. 1622. Воп. 1. Спр. 719.
10. РДГА. – Ф. 1267. Воп. 1. Спр. 26.
11. РДГА. – Ф. 1263. Воп. 1. Спр. 3142.
12. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў, далей – LVIA). – F. 385. Ap. 1. B. 834.
13. ПСЗРИ. Собр. 2-е. – Т. 44 (1869). – Ч. 1. – № 46807.
14. РДГА. – Ф. 1282. Воп. 3. Спр. 173.
15. РДГА. – Ф. 1283. Воп. 1. Спр. 41.
16. ПСЗРИ. Собр. 2-е. – Т. 44 (1869). – Ч. 3 : Штаты и табели. – № 46807. – С. 65.

*References*

1. *Sambuk, S. M.* Politika carizma v Belorussii vo vtoroj polovine XIX veka / red. V. P. Panyutich. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1980. – 223 s.
2. *Zhytko, A. P.* Dvaranstva Belarusi peryyadu kapitalizmu. 1861–1914 gg. : managrafiya / A. P. Zhytko. – Minsk : BDPU, 2003. – 233 s.
3. *Kahanoŷski, A. G.* Sacyyal'naya transfarmacyya belaruskaga gramadstva (1861–1914 gg.) / A. G. Kahanoŷski. – Minsk : Belarus. dzyarzh. un-t, 2013. – 335 s.
4. *Tokc', S. M.* Sacyyal'nyya i kul'turnyya pracesy ŷ belaruskaj vyoscy ŷ drugoj palove HIH – pachatku HH st. / S. M. Tokc'. – Minsk : DIKST BDU, 2016. – 327 s.
5. *Dolgach, T. V.* Gubernskie po krest'yanskim delam prisutstviya na territorii Belarusi: formirovanie, struktura, deyatel'nost' (1861–1903 gg.) : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / T. V. Dolgach. – Minsk, 2019. – 200 s.
6. Polnoe sobranie zakonov Rossijskoj imperii (dalej – PSZRI). Sobr. 2-e. – T. 36 (1861). – Otd. 1. – № 36660.
7. Muzej grafa M. N. Murav'eva. Arhivnye materialy Murav'evskogo muzeya, otnosyashchiesya k pol'skomu vosstaniyu 1863–1864 gg. v predelah Severo-Zapadnogo kraya : v 2 ch. – Vil'na : Gubernskaya tipografiya, 1913–1915. – Ch. 1 : Perepiska po politicheskim delam grazhdanskogo upravleniya s 1 yanvarya 1862 po maj 1863 g. / sost. A. I. Milovidov. – 1913. – 441 s.
8. Rasijski dzyarzhaŷny gistarychny arhiŷ (dalej – RDGA). – F. 908. Vop. 1. Spr. 171.
9. RDGA. – F. 1622. Vop. 1. Spr. 719.
10. RDGA. – F. 1267. Vop. 1. Spr. 26.
11. RDGA. – F. 1263. Vop. 1. Spr. 3142.
12. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (Litoŷski dzyarzhaŷny gistarychny arhiŷ, dalej – LVIA). – F. 385. Ap. 1. B. 834.
13. PSZRI. Sobr. 2-e. – T. 44 (1869). – Ch. 1. – № 46807.
14. RDGA. – F. 1282. Vop. 3. Spr. 173.
15. RDGA. – F. 1283. Vop. 1. Spr. 41.
16. PSZRI. Sobr. 2-e. – T. 44 (1869). – Ch. 3 : Shtaty i tabeli. – № 46807. – S. 65.
17. PSZRI. Sobr. 2-e. – T. 45 (1870). – Ch. 2. – S. 631, 632. – № 49091.


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

17. ПСЗРИ. Собр. 2-е. – Т. 45 (1870). – Ч. 2. – С. 631, 632. – № 49091.
18. LVIA. – F. 388. Ap. 1. B. 919.
19. РДГА. – Ф. 908. Воп. 1. Спр. 476.
20. Памятная книжка Витебской губернии на 1885 г. : / изд. Витебского губернского статистического комитета. – Витебск : Губернская типография, 1885. – [2], IV, 375, 124, XX с.
21. Главнейшие данные поземельной статистики по обследованию 1887 года / [предисл.: Н. Тройницкий]. – СПб. : Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1892-1901. – Вып. 22: Минская губерния. – 1896. – 15, 19 с.
22. ПСЗРИ. 3-е собр. –Т. 17 (1897). – № 13899.

18. LVIA. – F. 388. Ap. 1. B. 919.
19. RDGA. – F. 908. Vop. 1. Spr. 476.
20. Pamyatnaya knizhka Vitebskoj gubernii na 1885 g. : / izd. Vitebskogo gubernskogo statisticheskogo komiteta. – Vitebsk : Gubernskaya tipografiya, 1885. – [2], IV, 375, 124, XX s.
21. Glavnejshie dannye pozemel'noj statistiki po obsledovaniyu 1887 goda / [predisl.: N. Trojnickij]. – SPb. : Centr. stat. kom. M-va vnutr. del, 1892-1901. – Vyp. 22: Minskaya guberniya. – 1896. – 15, 19 s.
22. PSZRI. 3-e sobr. –T. 17 (1897). – № 13899.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ